**Назва вучэбнай дысцыпліны:**
**“Марфалогія (іменныя часціны мовы)”**

| | |
|---|---|
| **Код і назва спецыяльнасці** | 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура |
| **Курс навучання** | 2 |
| **Семестр навучання** | 3 |
| **Колькасць аўдыторных гадзін** | 56 |
| **Лекцыі**<br>**Семінарскія заняткі**<br>**Практычныя заняткі**<br>**Лабараторныя заняткі** | 28<br>28<br>-<br> |
| **Форма бягучай атэстацыі (*залік/дыферэнцаваны залік/экзамен*)** | дыферэнцаваны залік |
| **Колькасць заліковых адзінак** | 3 |
| **Фарміруемыя кампетэнцыі** | Тлумачыць, аналізаваць лінгвістычныя з'явы сучаснай беларускай мовы ў адпаведнасці са спецыфікай розных лексіка-граматычных разрадаў |

**Кароткі змест вучэбнай дысцыпліны:**

Граматыка як раздзел мовазнаўства. Граматычнае значэнне. Граматычныя катэгорыі. Граматычныя формы. Марфалогія і сінтаксіс як састаўныя часткі граматыкі. Марфалогія. Часціны мовы. Сістэма часцін мовы ў сучаснай беларускай літаратурнай мове. Самастойныя і службовыя часціны мовы. Назоўнік як часціна мовы. Скланенне назоўнікаў. Словаўтварэнне назоўнікаў. Марфалагічны аналіз назоўніка. Прыметнік як часціна мовы. Скланенне прыметнікаў. Формы прыметнікаў са значэннем суб’ектыўнай ацэнкі і меры якасці. Словаўтварэнне прыметнікаў. Марфалагічны аналіз прыметніка. Лічэбнік як часціна мовы. Разрады лічэбнікаў паводле значэння: колькасныя (уласнаколькасныя, зборныя, дробавыя) і парадкавыя лічэбнікі. Разрады лічэбнікаў паводле структуры: простыя, складаныя і састаўныя лічэбнікі. Асаблівасці сінтаксічнай сувязі лічэбнікаў з назоунікамі. Скланенне колькасных і парадкавых лічэбнікаў. Няпэўна-колькасныя словы. Марфалагічны аналіз лічэбніка.Займеннік як часціна мовы. Групы займеннікаў паводле суадноснасці з іншымі часцінамі мовы: абагульнена-прадметныя, абагульнена-якасныя, абагульнена-колькасныя. Разрады займеннікаў паводле значэння: асабовыя, зваротны, прыналежныя, указальныя, азначальныя, пытальныя, адносныя, адмоўныя і няпэўныя. Лексіка-граматычная характарыстыка займеннікаў розных разрадаў. Скланенне займеннікаў. Словаўтварэнне займеннікаў. Марфалагічны аналіз займенніка.